УДК 37.013.8:39(476):37.036

# ІНТРАВЕРТАВАНЫЯ І ЭКСТРАВЕРТАВАНЫЯ МЕТАДЫ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ: ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫЗНАЧЭННЯ

***С.Р. ТУБОЛЕЦ***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Артыкул прысвечаны вывучэнню тэарэтычных асноў вызначэння інтравертаваных і экстравертаваных метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Аўтар разглядае сродкі і метады беларускай народнай педагогікі, што традыцыйна ўжываліся ў эстэтычным выхаванні. У артыкуле прадстаўлена аўтарская класіфікацыя інтравертаваных і экстравертаваных метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы згодна з накіраванасцю на ўнутраны або знешні духоўны ці матэрыяльны свет. Сукупнасць метадаў рэалізуецца праз сям'ю, мясцовую суполку жыхароў, калектыў аднагодкаў і працэс самавыхавання. Адзначаецца, што мэта інтравертаваных метадаў – далучыць асобу да свету прыгажосці праз развіццё ўмення бачыць, адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць, эстэтычна перажываць з'явы прыгажосці (іх адсутнасць). Спецыфічная рыса экстравертаваных метадаў – скіраванасць на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць зносін, працы, творчасці, прыроды.*

**Уводзіны.** У XXI стагоддзі зноў на парадку дня стаіць пытанне аб ролі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей у жыцці чалавека. Сучаснае грамадства кіруецца ідэямі роўнасці, атэізму, свабоды як мэты, панавання над прыродай. Найважнейшымі характарыстыкамі дзейнасці становяцца карысць, рацыяналізм, уніфікацыя. Усё гэта паставіла на парадак дня пытанне неабходнасці перагляду, пераацэнкі каштоўнасцей і фарміраванне новай каштоўнаснай карціны свету, зварота да традыцыйнага сэнсу культуры і жыцця. Сёння актуальнымі становяцца супярэчнасці паміж наступнымі абставінамі:

- захаваннем індывідуальнай этнічнай самабытнасці народаў і асоб, і рэальнымі глабалізацыйнымі працэсамі, што вядуць да нівеліравання спецыфічных рыс у сувязі з працэсам агульнай уніфікацыі;
- патрэбнасцю чалавека да стабільнасці, рэальнасці знаходжання чалавечага "Я" і стварэннем "віртуальнай рэальнасці", якая змяніла структуру патрэбаў асобы (іх акцэнт перасунуўся на вобласць віртуальных уражанняў);
- патрэбай стварэння тэарэтычнай асновы для з'яўлення новых арганізацыйных формаў, накіраваных на эстэтычнае развіццё асобы ў эстэтычным плане і недастатковай увагай да традыцыйных падыходаў да гэтага працэсу, што склаліся ў народнай педагогіцы;
- традыцыйнай сістэмай эстэтычнага выхавання, якая фарміруе ў чалавека ўменні як успрымаць эстэтычныя з'явы свету, так і ажыццяўляць дзейнасць па іх захаванню і памнажэнню, і рэальна існуючым ростам прымітыўнага спажывецтва і разбурэння творчага пачатку, якія выяўляюцца ў прымяненні маніпуляцый чалавечай свядомасцю.

У той жа час эстэтычнае асваенне свету заўсёды з'яўлялася шляхам увядзення чалавека ў свет самастойнай, рэальнай творчай дзейнасці, з асаблівасцямі нацыянальнага асяродка. Можна сцвярджаць, што "творчасць па законах прыгажосці", асабліва заснаваная на этнакультурных традыцыях, прыстасаваная да калектыўнага несвядомага, здольна не толькі ўпрыгожыць, але і фактычна азначыць шляхі выратавання свету ад надыходзячай катастрофы бездухоўнасці і страты ўласнага чалавечага "Я", рэалізуе патрабаване грамадства аб рэальным праве кожнага чалавека, а не толькі эліты, на сапраўдную эстэтычна значную творчасць. Таму мэтай свайго даследавання мы ставім вылучэнне спецыфічных народна-педагагічных метадаў эстэтычнага выхавання.

Аб'ект даследавання – народная педагогіка; прадмет – метады эстэтычнага выхавання. Даследаванне выканана з выкарыстаннем комплексу ўзаемадапаўняльных метадаў: апісальна-аналітычнага, параўнальна-гістарычнага, а таксама гісторыка-педагагічнага аналізу, навукова-даследчых прыёмаў (інтэрпрэтацыя, супастаўленне, сістэматызацыя).

**Асноўная частка.** Любая культура грамадства мае зварот да чалавека, разглядае яго як пэўны культурны сэнс. У азначаным працэсе магчыма выдзеліць два аспекты. Па-першае, інтравертны, ці пабудова чалавека як храма, як найвышэйшай каштоўнасці яго ўнутранага свету, пачуццяў, унутранай дасканаласці. Другі аспект культуролагі вызначаюць як экстравертны, дзе галоўная ўвага ставіцца ўжо на пабудову свету як чалавечага храма, адухаўленне навакольнасці, развіццё і ўдасканаленне культуры.

Выбудоўваючы канцэпцыю псіхалагічных падстаў культуры, К.Г. Юнг абгрунтоўвае псіхалагічныя тыпы мыслення: экстравертны і інтравертны, рацыянальны і ірацыянальны, разумовы і інтуітыўны [1]. Такім чынам, ён апісвае два тыпы ўспрымання свету. Адзін тып мыслення характарызуецца зваротам на знешні свет, другі накіраваны ўнутр свядомасці, прызначаны на прыстасаванне да калектыўнага несвядомага. Экстраверсія і інтраверсія – характарыстыкі індывідуальна-псіхалагічных адрозненняў чалавека,

найбольш выразныя бакі якой суадносяцца пераважна скіраванасці асобы на свет знешніх аб’ектаў, альбо на з’явы яго асабістага суб’ектыўнага свету [2].

Усялякі народ валодае сваімі асаблівымі характарыстыкамі, якія і ствараюць менталітэт народа. Спецыфіка псіхалагічнага жыцця людзей вызначаецца сацыяльнымі абставінамі, пэўным гістарычным перыядам, залежыць ад мэтанакіраванасці выхавання, традыцый і звычаяў грамадства. Такім чынам, менталітэт звязаны са з’явамі народнай культуры, у прыватнасці з народнай педагогікай, якая фарміруе традыцыйныя погляды, спосабы дзеяння, стану і ладу чалавечага жыцця. У сваю чаргу эстэтычнае выхаванне – элемент культуры, бо кожны народ мае свае асаблівасці эстэтычнага ідэалу, традыцый, каштоўнасцей. Характарыстыкай эстэтычных адносін чалавека да свету з’яўляецца шматаспектнасць і цэласнасць, бо яны ахопліваюць матэрыяльную і духоўную сферы чалавечай дзейнасці.

Сам тэрмін “эстэтыка” паходзіць ад “aisthetikos” – адчувае, які адносіцца да пачуццёвага ўспрымання. Сёння эстэтыка з’яўляецца філасофскай навукай, што вывучае сферу двух узаемазвязаных колаў з’яў: сферу эстэтычнага як спецыфічнай праявы каштоўнасных адносін чалавека да свету і сферу мастацкай дзейнасці людзей [3]. Эстэтычнае выхаванне ўяўляе сабой “мэтанакіраваны працэс фарміравання ў чалавека эстэтычных адносін да рэчаіснасці” [3, с. 256]. Эстэтычнае выхаванне звязана з успрыманнем і разуменнем прыгожага ў рэчаіснасці, асалодай ім, эстэтычнай творчасцю чалавека. Яно дазваляе захаваць і памножыць здабыткі матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Мы разумеем эстэтычнае выхаванне як мэтанакіраваны працэс выхавання ў асобе жадання, здольнасці ўспрыняцця і разумення прыгожага ў жыцці, створанага пад уплывам грамадскіх каштоўнасных ідэалаў; прывіццё на гэтай глебе эстэтычных густаў, эмацыянальных адносін да акаляючага свету і сацыяльнага жыцця праз авалоданне культурай і сацыяльнае ўзаемадзеянне. Вызначэнне мае пад увагай акцэнт на знешні свет і ўнутраны мір асобы. Бо духоўнае абапіраецца на матэрыяльнае, асабістае звязана з безасабовым. Гэтым безасабовым чалавек звязаны са светам аб’ектыўна-безумоўнымі рэакцыямі, якімі ён адклікаецца на знешнія сігналы (колер, гук і г.д.), што становіцца адпраўной кропкай для разгортвання наступнай культурна абумоўленай эстэтычнай рэакцыі. Фактычна, мы звяртаемся да юнгаўскай канцэпцыі псіхалагічных падстаў культуры з дзвюма тыпамі мыслення, успрымання свету. Адзін тып мыслення характарызуецца зваротам на знешні свет, другі накіраваны ўнутр свядомасці, прызначаны на прыстасаванне да калектыўнага несвядомага. Інтравертаванае мысленне незаменна для сапраўднай творчасці, экстравертаванае – для змянення свету. Прынцыпова, што ў межах асобы кожнаму чалавеку ўласцівыя абодва механізмы, яны злучаюцца і ўзаемадапаўняюцца. Інтравертаванасць і экстравертаванасць выражаюць натуральны жыццёвы рытм, які ўласцівы прадстаўнікам розных супольнасцей, аднак у масавым парадку існуе пэўная розніца іх праяў у межах масавых чалавечых згуртаванняў.

Творчы аналіз канцэпцыі К.Г. Юнга [1], разуменне народнай педагогікі як часткі культуры, вызначэнне эстэтычнага выхавання як працэсу, накіраванага як на ўнутраны (духоўны), так і знешні (сацыяльны ці матэрыяльны) свет, паспрыялі стварэнню асабістай класіфікацыі метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Асноўным крытэрыем класіфікацыі метадаў эстэтычнага выхавання з’яўляецца іх накіраванасць на ўнутраны свет асобы (*інтраверсія*) і накіраванасць ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет (*экстраверсія*). Істотнай рысай метадаў эстэтычнага выхавання з’яўляецца спецыфіка іх прымянення ў розных сацыяльных падгрупах, характэрных для беларускага сялянскага асяродка канца XIX – пачатку XX стагоддзя (сям’і, мясцовай суполцы жыхароў, асяроддзя аднагодкаў). З дапамогай сістэмы метадаў адбываецца паступовае і паэтапнае разгортванне працэсу эстэтычнага выхавання ў часе, далучэнне асобы да багацця эстэтычнай культуры, якая ў сваю чаргу прапануе змястоўна багатую дзейнасць пачуццяў, наяўнасць развітых формаў іх выражэння. Гэта дае якаснае пашырэнне ўяўленняў аб рэчаіснасці, паколькі пашыраецца сама магчымасць і гатоўнасць успрымання свету ў яго шматвобраззі. Эстэтычная культура становіцца паказчыкам здольнасці ўзаемадзеяння паміж светам знешнім, ад якога адштурхваецца ўспрыманне, і светам унутраным, дзе разгортваецца яго перажыванне.

Першая група метадаў (інтравертаваныя) спрыяе далучэнню асобы да свету прыгажосці: фарміраванне і развіццё ўмення адчуваць, успрымаць, разумець, ацэньваць прыгожае, перажываць эстэтычныя/неэстэтычныя з’явы. Другая група метадаў (экстравертаваныя) скіравана на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць у паводзінах, зносінах, працы, творчасці, прыродзе.

Важнай рысай метадаў эстэтычнага выхавання з’яўляецца спецыфіка іх прымянення ў розных сацыяльных падгрупах. Па-першае, гэта галоўны сацыяльны інстытут, у межах якога праходзіла і праходзіць выхаванне дзіцяці. Другім важным кампанентам выхаваўчага працэсу ў беларускай народнай педагогіцы з’яўляецца мясцовая суполка (як сукупнасць жыхароў, што аб’яднаны формамі сумеснага жыцця і дзейнасці ў пэўных тэрытарыяльных межах). Трэцім – асяроддзе аднагодкаў, чые погляды, паводзіны, выхаванасць таксама ўплывалі на працэс выхавання, у нашым выпадку – эстэтычнага. І нарэшце, чацвёрты кампанент, які прысутнічае пры выкананні любой дзейнасці, – сама асоба, яе рэагаванне на свае ўчынкі і на ўздзеянне з іншых бакоў. Прапануем наша бачанне прызначэння метадаў эстэтычнага выхавання ў жыцці беларусаў і іх рэалізацыю ў кантэксце сацыяльных груп вёскі (табліца).

Суадноснасць групы выхавальнікаў і метадаў эстэтычнага выхавання

| Метады эстэтычнага выхавання | Група выхавальнікаў | | | |
|---|---|---|---|---|
| | сям'я | мясцовая суполка жыхароў | равеснікі | асоба |
| Успрыняцце, разуменне прыгажосці (*інтравертаваныя метады*) | Перакананне, праца, прыклад і аўтарытэт,назіранне, гульня, парада, прывучанне, унушэнне, тлумачэнне, заахвочванне, запалохванне, ухваленне, вымова, зварот да эстэтычнага пачуцця, павага да старэйшых | Грамадская думка, заахвочванне, асуджэнне, ухваленне, прыклад і аўтарытэт, распавед і гутарка, узаемная павага | Праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, гутарка, практыкаванне, грамадская думка, запалохваннне | Саманазіранне, самааналіз, самаўнушэнне, самаперакананне, гульня, саматлумачэнне, самазапалохванне, самавымова, пачуццё павагі да старэйшых |
| Стварэнне і захаванне прыгажосці (*экстравертаваныя метады*) | Практыкаванне, ухваленне, праца, вымова, прывучэнне | Іспыт, праца, грамадская думка, спаборніцтва, хваленне, вымова | Праца, сумеснае баўленне часу, гульня, пастаноўка перспектывы, супарадкі | Практыкаванне, праца, самапланаванне, гульня |

Да сродкаў эстэтычнага выхавання мы адносім гульню, працу, рамёствы, мову, народную творчасць, традыцыі, святы, звычаі, абрады, эстэтыку паводзін, быту, арганізацыю прасторавага асяроддзя пражывання, рэлігію, прыроду – галіны творчасці і жыццядзейнасці, пры дапамозе якіх ідзе эстэтычнае ўздзеянне на асобу.

*Гульні*, прасякнутыя эмацыянальным пачуццём, атмасферай святла і радасці, спрыяюць пачуццёваму знаёмству з рэчаіснасцю, найбольш пашыраныя ў дзіцячыя гады. Сродкам эстэтычнага выхавання, старажытным і ўсеагульным, з'яўляецца *праца, рамёствы*. Асаблівасці гэтай дзейнасці з'яўляюца найбольш уплывовымі і шматграннымі. Праз развіццё мыслення чалавека яны паспрыялі ўзнікненню *дэкаратыўна-прыкладнога* мастацтва, якое аздабляла жыццё, паказвала прыгажосць навакольнага асяроддзя, чалавечай душы і спраў.

З узнікненнем працы пачынаецца фарміраванне грамадства. Атрымлівае развіццё *мова*, з якой нараджаецца ўся разнастайнасць вуснай народнай творчасці, што напаўняе духоўнае жыццё чалавека, скарбонкі ведаў па ўсіх накірунках выхавання, у тым ліку і эстэтычнага.

*Традыцыі, звычаі, святы, абрады* як сінкрэтычныя формы засваення рэчаіснасці выступаюць сродкам эстэтычнага выхавання людзей. Народныя традыцыі забяспечвалі і зберагалі асаблівае псіхалагічнае асяроддзе, што спрыяе духоўнай сувязі пакаленняў, закладвалі асновы эстэтычнага выхавання. Да святаў найбольш старанна прыбіралі ў хаце, мыліся самі, надзявалі лепшае адзенне, упрыгожвалі быт. Менавіта працоўныя зразумелі і пачалі выкарыстоўваць выхаваўчы моц свята. *Арганізацыя прасторавага асяроддзя пражывання* павінна была адпавядаць уяўленням насельніцтва аб прыгажосці, мэтазгоднасці, гармоніі. У эстэтыцы быту імкнуліся выпрацаваць пачуццё рытму, гармоніі.

У якасці сродку эстэтычнага выхавання выступае *эстэтыка паводзін, быту*. Эстэтыку паводзін можна разумець як сістэму прыёмаў знешніх паводзін чалавека, яго характар, скіраванасць учынкаў. Кожны член вясковай суполкі павінен паводзіць сябе такім чынам, каб прыемна было і яму, і яго суседзям (было прынята вітацца не толькі са знаёмымі, але і незнаёмымі людзьмі).

Важныя сродкі эстэтычнага выхавання – *рэлігія* і *прырода*. Праваслаўе давала прыклад таго, як трэба чалавеку жыць, пераадольваць цяжкасці. Але праяўленні прыроды ў большай ступені тлумачылася паганскімі культамі.

Сродкі народнай педагогікі выкарыстоўваюцца ў працэсе рэалізацыі метадаў эстэтычнага выхавання. Адзначым, што за стагоддзі свайго існавання беларуская народная педагогіка назапасіла шмат разнастайных метадаў, з дапамогай якіх выхоўваюцца новыя пакаленні. Розныя галіны выхаваўчай работы скарыстоўваюць уласныя метады; гэта ж датычыцца і праблемы эстэтычнага выхавання. Прапануем характарыстыку яго метадаў, сістэма ўжывання якіх адбіта намі ў табліцы.

*Прыклад і аўтарытэт* як метад народнай педагогікі, звязаны з існаваннем асоб, што з'яўляліся арыенцірам у жыцці, стаўленні да працы і грамадства, паводзінах (рэальныя людзі, героі народнай творчасці). Без асабістага прыкладу бацькоў, аўтарытэтных людзей выкарыстанне іншых метадаў амаль нічога не ўнесла б для эстэтычнага выхавання чалавека. Шмат у чым народная педагогіка беларусаў – сямейная педагогіка, сфера практычнай дзейнасці бацькоў па выхаванні дзяцей на аснове традыцый сям'і, з улікам рэгіянальных і культурных асаблівасцей. Ад сям'і, ад бацькі з маткай усё добрае і ўсё благое: "Якое карэнне, такое і насенне" [4]. У найбольшай ступені менавіта бацькі – прыклад і аўтарытэт, і таму адзін з асноўных пастулатаў педагогікі беларусаў – аб неабходнасці паважлівых адносін дзяцей да дарослых. Ад іх пераймаецца, як працаваць, святкаваць, паводзіць сябе з аднавяскоўцамі.

Метады *ўнушэння, пераканання,* спрыяючы эстэтычнаму выхаванню чалавека, асабліва прыдатны ў маленстве, калі з дапамогай калыханак, пацешак, казак дарослыя ўздзейнічаюць на выхаванца: словы прымаюцца як ісціна. Азначаная ж функцыя выразна высвечваецца ў прыказках і прымаўках. Перакананні накіраваны да розуму. У суадносінах з традыцыйнымі народна-педагагічнымі поглядамі на эстэтычнае выхаванне яны ўслаўляюць прыгажосць чалавека-працаўніка, сумленнага, высокамаральнага і добрага. Асуджаючы неэстэтычныя рысы, выкрываецца іх сутнасць, паказваецца неабходнасць прыгожых учынкаў, паводзін, ладу жыцця.

Калі дзіця паводзіла сябе адпаведна ўяўленням народа аб прыгажосці, працы, адносін, дарослыя *ўхвалялі, адабралі* ўчынкі, выказвалі станоўчыя адносіны, што выклікала станоўчыя эмоцыі, садзейнічала фарміраванню добразычлівасці, чуласці, жадання быць яшчэ лепшым. Бацькі ў якасці ўхвалення выкарыстоўвалі ўсмешку, удзячнасць, даручэнне больш складанай справы, падзяку, падарунак. Дарэчы, у традыцыях народнай педагогікі было даволі строгае выхаванне, таму выказаныя бацькамі станоўчыя заўвагі, падарункі былі вельмі дарагімі для дзіцяці, садзейнічалі ўздыму сіл, стымулявалі імкненне да супрацоўніцтва, развівалі жаданне прынесці карысць і радасць сямейнікам. Аднак калі дзіця вяло сябе непрыгожа, не выконвала патрабаванняў, свавольнічала, выкарыстоўваліся *пакаранні.* Лічылася, што пакаранне – моцны сродак уздзеяння, таму найбольш пашыранымі яго формамі былі вусныя – заўвагі, пагроза. “Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі” [5] – погляд народа на тое, што дзецям больш патрэбна не пакаранне, а правільная арганізацыя працы, вольнага часу, своечасовае фарміраванне навыкаў. Аднак бацькі могуць звярнуцца і да фізічнага пакарання, бо “не слухае ківа, паслухае кія” [4].

Паступова ўнушэнне замяняецца метадам *пераканання*, які можна разглядаць як свайго роду асвету, з дапамогай якой беларусы давалі дзецям веды аб каштоўнасцях, што спрыяла асэнсаванню і ўзбагачэнню асабістага эстэтычнага вопыту асобы, фарміраванню эстэтычнай самасвядомасці, раскрывала сутнасць эстэтычнага ідэалу, садзейнічала эстэтычнаму самаўдасканальванню. У казачных творах, напрыклад, найбольш прывабнымі рысамі надзелены станоўчыя героі, каб давесці думку аб непарыўнай еднасці дабрыні і прыгажосці. Для беларусаў прыгажосць чалавека ў працоўнай актыўнасці, што фарміруе традыцыю прадстаўлення фальклорнага героя як знешне прыгожага працавітага асілка. Адначасова казкі пераконваюць у перамозе дабра і прыгажосці і даказваюць неабходнасць глыбокай ацэнкі чалавека, патрабуюць адрозніваць яго ўнутраны свет ад знешняга выгляду, умець бачыць духоўную прыгажосць ці выродлівасць. Так, неэстэтычныя рысы ўласцівы тым, хто ўвасабляе злое і нядобрае, а станоўчы герой перажывае знешняе ператварэнне і мае эстэтычна значную ўзнагароду. Адначасова далучаецца метад *тлумачэння*, каб асоба лепш успрыняла запатрабаванні, у тым ліку і эстэтычныя. Найчасцей тлумачэнні аб’ядноўваліся з такім метадам, як *гутарка*.

Метады *прывучэння і практыкавання* выкарыстоўваюцца пры навучанні дзеянням, набыцці навыкаў, уменняў, пры выпрацоўцы звычак, замацаванні ведаў. Шмат народных правіл, звычаяў мае сэнс – упрыгожыць жыццё, даць маладым арыенцір: як рабіць лепш, каб было прыгожа. Напрыклад: “Як абіваюць лён, трээ пець песні, та праз усю работу зы льном будзе спявацца” [6, с. 91].

Сялянскае жыццё будавалася на падставе метаду ўзаемнай павагі. Народ выносіць меркаванне аб маральных, працоўных якасцях жыхароў, іх дасканаласці. Зразумела, што найлепшыя людзі мелі найбольшую пашану ў вёсцы, з імі раіліся, высока ацэньвалі іх думкі, яны былі прыкладам для жыхароў вёсцы. Існаваў звычай называць у гонар такіх людзей нованароджанае дзіця.

*Праца* выступае адначасова як сродак і як метад эстэтычнага выхавання, дазваляе не толькі выхоўваць, але і правяраць яго якасць. Асэнсаваная, карысная праца абуджае пачуццё прыгожага, і народ не ўяўляе жыцця без працы, прасякнутай эстэтычнымі перажываннямі. У народнай працоўнай творчасці праяўляюцца густ і духоўныя памкненні чалавека, што прайшлі праз прызму нацыянальных традыцый. У вырабах спалучаюцца ўтылітарная, эстэтычная і сімволіка-абрадавая функцыі, яны з’яўляюцца творамі самабытнага народнага мастацтва. Народ пераконвае, што ўшанаванню належыць чалавек, які не проста завіхаецца па гаспадарцы, а вядзе яе прыгожа, якасна (“Не пытайся, ці галоўка гладка, а пытайся, ці падмецена хатка” [1]). Эстэтызацыя акаляючага асяроддзя, што адбываецца ў працэсе працы, аказвае ўскосны ўплыў на выхаванне падрастаючага чалавека.

З дапамогай працы адбываюцца ўсе перамены ў жыцці: з’яўляюцца і ўпрыгожваюцца вырабы, арганізуецца дзейнасць. У працоўнай дзейнасці праяўляюцца эстэтычныя адносіны, гучаць *патрабаванні*: “Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць”. Нават самае невялікае даручэнне, працоўную аперацыю трэба выконваць прыгожа, старанна, творча. Каб гэта атрымалася, паказваюцца прыёмы працы, *тлумачыцца* і патрабуецца прыгожае выкананне; звычайна прыгаворвалі: рабі так, каб было прыгожа. Этнографы адзначаюць, што ў вяскоўцаў выпрацавана звычка да выключна акуратнай, мернай пасадкі сельскагаспадарчых культур дзеля таго, каб узыходы радавалі вока.

У працоўнай дзейнасці выток шматлікіх народных *свят*, у якіх людзі спаборнічаюць у майстэрстве, розуме, спрыце. *Спаборніцтва* дапамагае эстэтычнаму выхаванню беларуса праз стымуляцыю жа-

дання становуча вылучыцца, атрымаць ухваленне, быць лепшым. Спаборніцтвы і не трэба аб'яўляць, бо кожны ведае, што 25 лютага выстаўляецца на мароз пража, а 2 красавіка выносяцца на вуліцу ільняныя палотны. Дзяўчаты хваляцца натканым палатном, прыгажосцю вышыўкі, якасцю адзення. Дарэчы, аб гэтым можна меркаваць як па святочнай вопратцы, так і па паўсядзённай, па пасагу. Хлопцы цэняцца за спрыт, майстэрства. У беларусаў па традыцыі моладзь вырабляе прыгожыя, неабходныя ў гаспадарцы рэчы, ад рукавіц да пярсцёнкаў і падносяць іх у падарунак каханым, сябрам, сваякам, родным. Добрая пагалоска спрыяе шлюбу, паважлівым адносінам аднавяскоўцаў.

Вялікі ўплыў на развіццё чалавека аказвае метад *назірання*. Назіральны хутчэй засвойвае разнастайнасць свету, больш кемлівы. У выніку шматгадовых уважлівых назіранняў чалавека за станам прыроды з'явіліся прыкметы. Яны выліліся ў прыгожую форму трапных радкоў, што дапамагаюць выказаць сваё эстэтычнае пачуццё, апісаць з'явы рэчаіснасці: "Вясна красна, хоць і галодная". Малыя фальклорныя формы аздабляюць і эстэтызуюць плынь сацыяльных зносін.

Назіранні дапамагаюць запомніць паслядоўнасць дзеянняў, традыцыйныя формы правядзення святаў, даюць веды аб тым, каго грамадская думка ацэньвае высока і за што. Назіранні за працай лепшых майстроў падштурхоўваюць да стварэння эстэтычна значных рэчаў. Адсюль ідзе пачатак існавання традыцыйных беларускіх промыслаў: керамікі, ткацтва, традыцыйнага адзення. Майстры імкнуліся прытрымлівацца спецыфічных мясцовых рыс выканання, дасягаць дасканаласці ў сваіх вырабах: рабіць так, каб зручная рэч радавала вока і доўга служыла.

Назіранні за дзейнасцю дарослых з'яўляюцца крыніцай для шматлікіх дзіцячых забаў. У шэрагу гульняў дзеці паўтараюць працоўныя працэсы, адлюстроўваюць некаторыя абрады, падзеі, звычаі. Назіранні спалучаюцца з *растлумачэннямі, унушэннямі, перакананнямі* – распаўсюджанымі і даступнымі метадамі эстэтычнага выхавання. Дзяцей пераконвалі ў неабходнасці прыгажосці ў адносінах з людзьмі, паводзінах, працы, дамашнім побыце. З узростам дзяцей пашыралася прымяненне метадаў: растлумачэнне суправаджалася *аналізам*, больш глыбокім і дэталёвым, дзеці атрымлівалі веды аб сутнасці эстэтычных поглядаў народа, яго норм і правіл.

Знаёмства з эстэтычнымі асаблівасцямі навакольнага свету, працоўных дзеянняў, чалавечых зносін, развіццё мастацкіх здольнасцей (спеваў, танцаў, дыферэнцыроўкі колераў), актыўнае фарміраванне непасрэднага пачуццёвага ўспрымання рэчаіснасці ў свядомасці, абуджэнне пачуццяў ідзе з дапамогай *гульні* (таксама, як і праца, сродку і метаду народнай педагогікі).

Гульня садзейнічае фарміраванню гатоўнасці дзіцяці да сацыяльна-псіхалагічнай дзейнасці, набыцця вопыту выканання сваіх сацыяльных функцый. Гэта школа эстэтычнай культуры для малога. Гульні вучаць быць уважлівымі, назіральнымі, знаходлівымі, развіваюць творчыя магчымасці.

Уплывовы метад народнай педагогікі – *грамадская думка*. Яна аказвае кіруючае, рэгулюючае ўздзеянне на жыццё людзей станоўчай ці адмоўнай ацэнкай іх учынкаў, гэта актыўная ўплывовая сіла, якая здольна кантраляваць сфарміраванасць у людзей эстэтычных якасцей, унутраных запатрабаванняў паводзіць сябе згодна эстэтычнага ідэалу без прымусу. Грамадская думка заахвочвае і асуджае, ухваляе і ганьбіць. І кожная сям'я, і асоба ўлічвалі ўплыў грамадскай думкі, прымалі пад увагу пазіцыю сваякоў, суседзяў, сацыяльнага асяроддзя. "Грамада – вялікі чалавек", яна мае ўстойлівыя, адпрацаваныя стагоддзямі формулы ўхвалення ці асуджэння. Арлова Г.П. адзначае: "Ацэньваючы тую ці іншую з'яву ў жыцці чалавека, народ бярэ гатовыя, універсальныя па змесце і форме характарыстыкі… Чалавек "узгадняе" свае паводзіны з адпаведнай грамадскай думкай" [5, с. 21].

Распаўсюджаны метады *заахвочвання, ухвалення і асуджэння, вымовы*. Асуджаюцца неахайнасць, лянота, сквапнасць, іншыя заганныя рысы. Заахвочваецца жаданне быць добрым, міласэрным, працавітым, сумленным, выхаваным, бо гэтыя якасці ўхваляюцца, разглядаюцца як найлепшыя. Дарэчы, даволі часта заахвочванне пераходзіла ва ўхваленне, а асуджэнне цягнула за сабой вымову.

Пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ адбываліся *супрадкі, вячоркі*. Гэты метад народнай педагогікі пабудаваны на камбінацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай творчасці. Жанчыны, дзяўчыны займаліся рукадзеллем у адной хаце, спявалі. Кожная імкнулася паказаць сябе майстрыцай, прыгожай, разумнай, здольнай на жарты і прыгожую песню. Да іх прыходзілі хлопцы, і тады супрадкі суправаджаліся забавамі, спевамі. "Выбірай жонку не ў карагодзе, а на рабоце" – аб гэтым ведалі і хлопцы, і дзяўчаты, таму звычай быў вельмі папулярны.

Метад *запалохвання* заснаваны на высокай унушальнасці, вобразнасці ўспрыняцця і мыслення. Праз жудасныя вобразы, абяцанні нейкіх нешчаслівых выпадкаў прымушаў дзіця выконваць патрабаванні дарослых (а падчас і не толькі дзіця, але і дарослых, напрыклад, цяжарную жанчыну).

З*варот да эстэтычнага пацуцця* спрыяў імкненню зрабіць так, каб было прыемна, прыгожа і сабе, і людзям. З 15-ці год дзяўчынкі пачыналі рыхтаваць пасаг, аздаблялі яго вышыўкай і карункамі, вучыліся рыхтаваць смачную ежу (каб прыемна елася, хапала ўсім і была падрыхтавана ў час), даглядаць за парадкам у хаце, прыглядаць за меншымі брацікамі і сястрычкамі. Каб быць прыгожымі, дзяўчынкі рыхтавалі сабе пацеркі з ягад, вянкі з кветак. Усе справы заўважаліся не толькі бацькамі, але і равеснікамі,

таму і выбіралася найпрыгажэйшая і найспрытнейшая дзяўчына на свята, для выканання нейкага абрада па выніках дзейнасці (на Тройцу роля Куста, Русалка ў русальны тыдзень [7]). Ідзе перакананне, што ўшанаванню належыць чалавек, які не проста завіхаецца па гаспадарцы, а вядзе яе прыгожа, якасна.

Паколькі эстэтычнае выхаванне арганічна звязана з маральным, іх адзінства адлюстроўваецца ў каштоўнаснай устаноўцы, згодна з якой прыгожае тое, што маральна, што ўзвышае чалавека. Маральнае ў сваю чаргу павінна існаваць ва ўнутранай сувязі з прыгожым. Былі запатрабаваны метады *ўзаемнай павагі* паміж удзельнікамі выхаваўчага і жыццёвага працэсу, *агульнай эстэтыкі паводзін* (і метады, і вынікі эстэтычнага выхавання). Эстэтыка паводзін, быту, пачуццяў напрамую залежыць ад умоў, у якіх праходзіць жыццё чалавека (мы засяроджваем увагу на тым каштоўным, карысным для эстэтычнага выхавання, што засталося ад продкаў). Шмат народных правіл, звычаяў аформлена ў выглядзе прымхаў, забабонаў і г.д., галоўны сэнс якіх – упрыгожыць жыццё, даць маладым арыенцір: што можна і чаго нельга рабіць, як рабіць лепш, каб было прыгожа (гл. [6, с. 91]). На выпрацоўку паводзін былі скіраваны апавяданні пра міфічных апекуноў хаты, лесу, вады. Напрыклад, казалі і верылі, што дамавік любіць гаспадароў і гаспадынь працалюбівых, рахманых і цвярозых; што ўсе іх дзеянні яму падабаюцца, не любіць сварак, бруду ў хаце і хляве, асабліва на сцежках [8].

Дарослыя вучаць дзяцей не толькі бачыць, заўважаць, любіць прыгожае, але і прывучаюць да клопатаў аб прыгажосці. Праз народную педагогіку праходзіць думка, што выхавальнік павінен ведаць, што з'яўляецца прыгожым, эстэтычным; што ўяўляе сабой эстэтычны ідэал і шляхі набліжэння да яго; нарэшце, ён сам, учынкі, быт павінны быць эстэтычнымі, інакш кажучы, аб'ядноўваць імкненні, словы і справы людзей. Беларуская народная педагогіка актыўна прапагандуе працэс самавыхавання. Асоба павінна праходзіць станаўленне ў зносінах, у вырашэнні шматлікіх задач. Гэты працэс будзе вызначальным для значнасці асобы і яе дзейнасці ў грамадстве. Пра значнасць самаўдасканалення гавораць казкі: знешне і сацыяльна невыразны галоўны герой, прайшоўшы шэраг выпрабаванняў, пераўтвараецца ў добрамоладца, бярэ шлюб з прыгажуняй.

Праз саманазіранне і самааналіз чалавек вучыўся знаходзіць тое ў навакольным і грамадскім жыцці, што кранае яго душу, вабіць знешне. Самааналіз праходзіць праз усю сістэму прыказак і прымавак (у якіх замацаваны маральна-этычны кодэкс народа). Шляхам іх штодзённага ўжывання чалавек аналізуе жыццё, свае ўчынкі, а гэта значыць, узгадняе паводзіны, дзеянні з ідэаламі. Маральна, добра, па-чалавечы – прыгожа. Так, уся сістэма прыказак і прымавак беларускага народа з'яўлялася маральна-практычнай філасофіяй жыцця. Гэта карэктавала пачуцці, свядомасць, паводзіны.

Распаўсюджана *самаўнушэнне*. Беларус верыў, што выкананне спраў у традыцыйным строга зафіксаваным парадку, то гэта паспрыяе ўрадлівасці глебы, моцы жывёлы, заможнасці гаспадаркі – дабрабыту, які разглядаўся як неад'емная частка эстэтычнага ідэалу, да якога мелі намер наблізіцца [7].

Успрыняцце паразумення прыгажосці ў працэсе самавыхавання асобы ішло і праз *пачуццё павагі да старэйшых*. Яно фарміравала асаблівы душэўны настрой, які перадаваўся ў такіх павер'ях, што Бог, калі ходзіць па зямлі, набывае вобраз старца. Старцы разглядаліся як носьбіты долі, лічылася, што, калі падчас нараджэння дзіцяці ў хату завітае старац – дзіця будзе шчаслівае [8, с. 448].

Знаходзячы нешта незвычайнае, непрыгожае беларус *самазапалохвася*. Гэта спрыяла імкненню чалавека звяртаць увагу на прыгажосць-непрыгажосць рэчаіснасці, абмінаць непрыгожыя мясціны.

Дзейнасць і дзіцяці, так і дарослага мела этап *самапланавання*. Каб распачаць гульню, трэба было зрабіць цацку. Рэчы з дапамогай фантазіі пераносілі дзіця ў цудоўны фантастычны свет, дзе здзяйсняліся яго цудоўныя мары: пра багаты статак, незвычайны ўраджай, прыгажунь у незвычайнай вопратцы.

Працэс самапланавання асобы індывідуальны, аднак таму, што гаспадарка на Беларусі мела шмат рысаў натуральнай, можна меркаваць, што яно адбывалася бесперапынна і дазваляла чалавеку знаходзіць найлепшыя шляхі да асэнсаванай, эстэтычна значнай працы. Так, пры змене сацыяльнага статусу, чалавек павінен быў карэктаваць свой вонкавы выгляд – трансфармаваць адзенне. Такім чынам, як дзяўчына, так і хлопец планавалі, рыхтавалі сабе пэўныя элементы адзення, якія ўваходзілі ў іх гардэроб пасля ўступлення ў шлюб. Каб не атрымаць вымовы ад аднавяскоўцаў, трэба было спланаваць і вырабіць фартух, кашулю, ручнікі і інш. Майстрыца сама задумвала рэч і сама выконвала ўсе працоўныя аперацыі, прытрымліваючыся традыцыйных мясцовых эстэтычных канонаў.

Народ разумее, што эстэтычна выхоўвае не проста прыгожае навакольле, а самі людзі, іх праца, бо вучыць не толькі заўважаць і любіць прыгожае, але і актыўна клапаціцца пра яго. Праз народную педагогіку праходзіць думка, што выхавальнік павінен ведаць, што з'яўляецца прыгожым; што ўяўляе сабой эстэтычны ідэал і шляхі набліжэння да яго; нарэшце, ён сам, учынкі, быт павінны быць эстэтычнымі, інакш кажучы, аб'ядноўвае імкненні, словы і справы чалавека.

**Заключэнне.** Беларуская народная педагогіка захавала традыцыйны падыход да вырашэння праблемы эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення. Аналіз матэрыялаў фальклору, этнаграфічных, гісторыка-педагагічных прац дае падставу сцвярджаць, што традыцыйнае выкарыстанне метадаў эстэ-

тычнага выхавання мае этнічныя асаблівасці, што звязана з уяўленнямі аб вобразе ідэальнай асобы, асаблівасцямі рэалізацыі праз сям'ю, мясцовую суполку жыхароў, калектыў аднагодкаў і працэс самавыхавання. Шэраг традыцыйных метадаў народнай педагогікі мае спецыфічнасць выкарыстання на падставе традыцыйных сродкаў выхавання. Гэтыя метады класіфікаваны згодна з накіраванасцю на ўнутраны або знешні духоўны ці матэрыяльны свет. Да *інтравертаваных метадаў* (што характаразуюцца накіраванасцю на ўнутраны свет асобы і маюць мэтай далучыць асобу да свету прыгажосці) адносім: асуджэннне, вымову, грамадскую думку, гульню, гутарку, заахвочванне, запалохванне, зварот да эстэтычных пачуццяў, назіранне, павагу да старэйшых, перакананне, практыкаванне, працу, прывучэнне, прыклад і аўтарытэт, расповед, саманазіранне, тлумачэнне, узаемную павагу, унушэнне, ухваленне. *Экстравертаванымі метады* (накіраваныя ад асобы на знешні духоўны ці матэрыяльны свет, скіраваныя на фарміраванне ўменняў ствараць і захоўваць прыгажосць зносін, працы, творчасці, прыроды) мы лічым: вымову, грамадскую думку, гульню, іспыт, пастаноўку перспектывы, практыкаванне, працу, прывучэнне, спаборніцтва, сумеснае правядзенне вольнага часу, супарадкі, ухваленне.

ЛІТАРАТУРА

1. Юнг, К.Г. Психологические типы / К.Г. Юнг. – М.: Попурри. – 1998. – 656 с.
2. Современный словарь по педагогике / сост. Е.С. Рапацевич. – Минск: Современное слово, 2001. – 928 с.
3. Большая Советская Энциклопедия: в 30 т. / гл. ред. А.М. Прохоров. – М.: Сов. энцикл. – Т. 30. – 631 с.
4. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 120 с.
5. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; прадм. У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
6. Крук, І.І. Следам за сонцам: беларускі народны каляндар: дапам. для педагогаў дзіцячых дашкольных устаноў / І.І. Крук. – Мінск: Ураджай, 1998. – 216 с.
7. Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

*Поступила 04.04.2012*

**INTROVERSIVE AND EXTRAVERSIVE METHODS OF AESTHETIC EDUCATION IN BELARUSIAN FOLK PEDAGOGY: THEORETICAL BASIS FOR DEFINITION**

***S. TUBOLETS***

*The article is devoted to studying of the theoretical foundations and definition of introversive and extraversive methods of aesthetic education in Belarusian folk pedagogy. The author examines means and methods of Belarusian folk pedagogy, that have been traditionally used in aesthetic education. The article presents the author's classification of introversive and extraversive methods of aesthetic education in Belarusian folk pedagogy guided by the internal or external spiritual or material world. A combination of methods is employed through the family, local community, educators and peer-education process. It is noted that introversive methods pursue the purpose of linking a person to the world of beauty by developing the ability to see, feel, perceive, understand, evaluate and aesthetically experience the phenomenon of beauty (absence thereof). A specific feature of the extraversive methods resides in their focus on the formation of skills meant to help recognize and maintain the beauty of communication, work, creativity and nature.*